# АСАБЛІВАСЦІ СТАЛЫПІНСКАЙ АГРАРНАЙ РЭФОРМЫ Ў БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ

І. А. Клімава, С. Я. Гратынская, В. М. Лянцэвіч

Тэма аграрнай рэформы, якая праводзілася пад кіраўніцтвам П.А. Сталыпіна ў пачатку XX ст., на сённяшні дзень лічыцца вельмі актуальнай – гэта тэма, запатрабаваная самім жыццём, праз стагоддзе паставіла на парадак дня пытанне аб рэформе зямельных адносін, якая наспела ў пачатку XX ст. Аграрнае пытанне існавала ў кожную гістарычную эпоху, паколькі тэма размеркавання зямлі паміж людзьмі актуальная заўсёды, змяняўся толькі яе змест.

*Сталыпінская аграрная рэформа* – буржуазная рэформа сялянскага надзельнага землеўладання ў Расійскай імперыі ў 1906 – 1907 гг., якая атрымала імя тагачаснага міністра ўнутраных спраў, старшыні Савета міністраў Пятра Аркадзьевіча Сталыпіна, аднаго з яе ініцыятара, аўтараў і кіраўнікоў.

*Галоўнай задачай* Сталыпіна-рэфарматара было ўмацаванне сацыяльнай базы існуючага ладу. Бурныя падзеі XX ст. пераканалі яго ў тым, што шчыра адданае царскай уладзе памеснае дваранства не можа ў адзіночку служыць ёй дастаткова надзейнай апорай. У той жа час не апраўдалі сябе і спробы ўлады абаперціся на ўсёсупольнае сялянства ў цэлым з яго традыцыйнай апалітычнасцю і верай у «добрага цара». Сталыпін, сам будучы землеўласнікам, правадыром губернскага дваранства, ведаў і разумеў інтарэсы памешчыкаў; на пасадзе губернатара ў перыяд рэвалюцыі бачыў паўстанцаў-сялян, таму для яго аграрнае пытанне не было абстрактным паняццем.

Такім чынам, *галоўныя прычыны аграрнай рэформы* бачацца ў:

1. нявырашанасці пытання аб зямлі;
2. існаванні феадальных перажыткаў;
3. росце рэвалюцыйнай актыўнасці сялян.

Цэнтральная ідэя рэформы заключалася ва ўпарадкаванні прыватнай уласнасці на зямлю і роспуску сялянскай абшчыны. На справе гэта азначала перавод абшчыннага сялянства на індывідуальнае валоданне гаспадаркай пры захаванні памешчыкаў у вёсцы. Меркавалася забяспечыць свабоду выхаду з абшчыны з замацаваннем надзельнай зямлі ў прыватную ўласнасць (хутар, водруб). Хутар – адасобленая сялянская сядзіба на зямельным участку індывідуальнага валодання; водруб – зямельны ўчастак, выдзелены з абшчыннага надзелу зямлі ў аднаасобную сялянскую маёмасць без пераносу сядзібы.

На гаспадарчае ўзмацненне пласта заможных сялян была накіравана і дзейнасць Сялянскага банка – ільготныя крэдыты на куплю часткі зямлі памешчыкаў і купля небарацкіх надзелаў (з развалам абшчыны яны не маглі цалкам весці аднаасобную гаспадарку). Хутарская гаспадарка шырока прапагандавалася ў друку. Ствараліся паказальныя хутары. Яны забяспечваліся лепшымі пародамі жывёлы, сартавым насеннем, тэхнікай. Арганізоўваліся

паказальныя гаспадаркі. Разгортваўся таксама кааператыўны рух. Шырокае распаўсюджванне атрымала стварэнне таварыстваў мяккага крэдыту, спажывецкіх таварыстваў.

*Мэты рэформы:* забяспечыць умовы хуткага развіцця эканомікі краіны; разбіць агульнасялянскі фронт супраць памешчыкаў, раскалоць вёску, паскорыць стварэнне сельскай буржуазіі з ліку заможнага сялянства, прыцягнуць яго на бок царскага ўрада і такім чынам паставіць перашкоду на шляху рэвалюцыйнага руху.

*Сродкі дасягнення мэтаў рэформы:* разбурэнне сялянскай абшчыны і перадача зямлі ў асабістую сялянскую ўласнасць, стварэнне хутароў і адрубоў, перасяленне беззямельных і малазямельных сялян у Сібір і іншыя ўскраінныя раёны імперыі.

Для паскарэння зямельных пераўтварэнняў 29 мая 1911 г. было прынята Палажэнне аб землеўпарадкаванні, паводле якога землеўпарадкавальныя камісіі маглі прымусова высяляць сялян на хутары і адрубы без згоды сялянскай большасці. На працягу 1907 – 1916 гг., у беларускіх вёсках было створана амаль 13 тыс. хутароў і адрубоў [1, с. 56].

Адначасова ажыццяўляліся меры па забеспячэнні трываласці і стабільнасці працоўных сялянскіх гаспадарак. Каб пазбегнуць спекуляцыі зямлёй і канцэнтрацыі ўласнасці, у заканадаўчым парадку абмяжоўваўся гранічны памер індывідуальнага землеўладання, быў дазволены продаж зямлі несялянам. У мэтах прадухілення ўтварэння буйных зямельных уладанняў Законам ад 14 чэрвеня 1910 г. «Аб зменах і дапаўненнях некаторых пастаноў аб сялянскім землеўладанні» было забаронена засяроджваць у межах аднаго павета шляхам пакупкі або прыняцця ў дар надзельнай зямлі звыш 6 душавых надзелаў.

Дадзены Закон вызначаў ўмовы выхаду з абшчыны: усе абшчыны, у якіх не было перадзелаў с часу надзялення іх зямлёй, прызнаваліся перайшэдшымі да спадчыннага валодання з правам асабістай уласнасці хатніх гаспадароў, на якія складаліся ў іх карыстанні землі.

Нягледзячы на вялікую колькасць малазямельных гаспадарак, на беларускіх землях быў створаны спецыяльны фонд для рускіх перасяленцаў. Ім дазвалялася і аказвалася дапамога ў куплі зямлі ў Беларусі. Галоўная прычына бачыцца ў імкненні ўрадавых колаў узамацніць рускі ўплыў у рэгіёне.

Яшчэ адзін накірунак рэформы – арганізацыя перасяленняў малазямельных сялян на малаасвоеныя землі Расійскай імперыі. Галоўны сэнс гэтай палітыкі быў у тым, што перасяленне сялян у іншыя рэгіёны павінна было вырашыць галоўную праблему – перанаселенасць, таму і стваралася шмат новых хутароў. Так, за 1906 – 1914 гг. з пяці заходніх(беларускіх) губерняў на землі Сібіры перасялілася 368 тыс. чалавек , каля 11% з іх вярнулася назад. Таксама, існаваў і іншы кірунак эміграцыі беларусаў – ЗША, Канада, Аргенціна, Бразілія, Аўстралія. Да 1913 г. эмігравала больш за 1,5 млн. чалавек, вярнулася каля 600 тыс (з-за непрыдатнасці прыродных і кліматычных умоў, адсутнасці належнай інфраструктуры) [2, с. 33].

Рэформа дапамагла росту сельскагаспадарчай вытворчасці. Да 1913 г. Беларусь стала найбуйнейшым рэгіёнам вырошчвання бульбы. Узраслі пасевы лёну, збожжавых культур. Памешчыцкія і кулацкія гаспадаркі залучаліся ў гандлёва-рынкавыя адносіны. У заходніх губернях Сталыпін імкнуўся падняць палітычную ролю заможнага сялянства ў сістэме мясцовых органаў кіравання, для чаго ў Магілёўскай і Віцебскай губернях у 1911 г. былі створаны земствы (упершыню і толькі на ўсходнебеларускіх землях пасля таго, як адпаведная рэформа была праведзена ў іншых рэгіёнах імперыі яшчэ ў 1864 г.), адкрыты майстэрні, сельскагаспадарчыя гурткі. Дзейнасць земстваў была накіравана ў першую чаргу на задавальненне ўладальніцкіх інтарэсаў заможнага сялянства і памешчыкаў.

На думку Сталыпіна, рэформа ў Беларусі павінна была аслабіць і выцесніць буйных землеўладальнікаў польскага паходжання. Для гэтага і выбары ў земствы павінны былі праводзіцца на курыяльнай аснове (па нацыянальнай прыкмеце) з розным падыходам да палякаў і рускіх. У гэтым выпадку, беларуская курыя не прадугледжвалася. Класавая пазіцыя буйных землеўладальнікаў выявілася адразу: яны аб’ядналіся супраць Сталыпіна.

Сталыпінская рэформа была арганічна звязана з аграрнай рэформай 1861 г., з’яўлялася яе працягам, другім крокам на шляху пераўтварэння самадзяржаўнай Расіі ў буржуазную манархію. Яна ўзмацніла вясковую буржуазію, пашырыла магчымасці для развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, але так і не вырашыла аграрнага пытання, не змагла прадухіліць наспяванне буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі [3].

*Вынікі і прычыны няўдачы рэформы:*

- Рэформа закранула фактычна толькі Магілёўскую і Віцебскую губерні. Да 1916 г. у гэтых губернях з абшчыны выйшла 63% сялян. Атрымаўшы зямлю ў прыватную ўласнасць, многія сяляне-беднякі прадавалі яе. За 9 гадоў сталыпінскай аграрнай палітыкі ў беларускіх губернях было створана звыш 12,8 тыс. хутароў і адрубоў, што складала 12% сялянскіх гаспадарак. Ім належала 10,8% усіх зямель, якія знаходзіліся ва ўласнасці сялян [4, с. 43].
- Рэформа Сталыпіна ў цэлым садзейнічала ўздыму сельскай гаспадаркі. З 1907 па 1913 гг. Пасяўныя плошчы ў Беларусі павялічыліся на 11%, пагалоўе буйной рагатай жывёлы вырасла на 10%, пагалоўе свіней–амаль на 10%. Рэформа спрыяла таксама павышэнню таварнасці сельскагаспадарчай вытворчасці.
- Аграрная рэформа садзейнічала ўздыму прамысловасці. Сярэдне гадавы прырост у прамысловасці склаў 13,9%. Нягледзячы на высокую ўдзельную вагу дробнатаварнай, паскорана развівалася буйная фабрычна-заводская вытворчасць. Валавая прамысловая прадукцыя ў 1913 г. перавысіла ўзровень 1908 г. на 67,5%. У гады эканамічнага ўздыму павялічылася доля акцыянернага капіталу. Аб’ём валавой прадукцыі акцыянерных таварыстваў вырас у 1900 – 1913 гг. у 52,2 разы. Ішоў рост канцэнтрацыі прамысловасці [5, с.763].

Лічыцца, што аграрная рэформа Сталыпіна спрыяла ломцы адсталага абшчыннага землекарыстання, росту вытворчасці збожжа і экспарту хлеба, паляпшэнню матэрыяльнага становішча сялян (рэформа ўключала адмену

выкупных плацяжоў, што станоўча адбілася на сельскай гаспадарцы і становішчы сялян), асваенню новых зямель. Аграрная рэформа была мэтазгодная, больш за тое, неабходная. У выпадку поспеху яна абяцала тым, хто да яе прыстасаваўся, больш інтэнсіўныя формы гаспадарання, вышэйшыя ўраджаі, больш высокі ўзровеньжыцця, а таксама трывалы ўнутраны рынак для прамысловасці, павелічэнне хлебнага экспарту і за яго кошт –пагашэнне вялізнага знешняга доўгу. Але ўсё гэта – у выпадку поспеху.

І ўсё ж, сталыпінскія пераўтварэнні не ўвянчаліся поспехам. Галоўная эканамічная іх мэта – адкрыць прастору для развіцця прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы, расчысціць дарогу капіталізму ў вёсцы – дасягнута не была. Увядзенне прыватнай подворной уласнасці на зямлю замест супольнай атрымалася ўвесці толькі ў чвэрці супольнікаў. Не ўдалося і тэрытарыяльна адарваць ад «міру» заможных гаспадароў, бо на хутарскіх і адрубных участках пасялялілася менш за палову кулакоў. Перасяленне на ўскраіны таксама не ўдалося арганізаваць у такіх памерах, якія змаглі б істотна паўплываць на ліквідацыю зямельнай цеснаты ў цэнтры.

Істотную ролю ў правядзенні сталыпінскай зямельнай рэформы на беларускіх землях адыграў Сялянскі пазямельны банк, які быў створаны яшчэ ў 1882 г. На тэрыторыі сучаснай Беларусі функцыянавалі пяць аддзялення ўдадзенага банка: Магілёўскае – з 1883 г., Гродзенскае – з 1885 г., Віцебскае – з 1886 г., Мінскае – з 1886 г., Віленскае – з 1887 г. У перыяд сталыпінскага землеўпарадкавання дзейнасць Сялянскага пазямельнага банка была засяроджана на наступных напрамках: выдача пазык, землеўпарадкаванне і дабрачыннасць. Для паспяховай рэалізацыі сталыпінскай аграрнай рэформы паўнамоцтвы Сялянскага пазямельнага банка і кола яго аперацый былі значна пашыраны. Банку дазвалялася купля зямлі ў любых колькасцях за кошт выпуску спецыяльных сведчанняў і выдача пазык пад заклад надзельных сялянскіх земляў. Будучы важным інструментам разбурэння абшчыны і насаджэнні дробнай прыватнай уласнасці,Сялянскі пазямельны банк прадаваў у крэдыт землі, скупленыя раней у памешчыкаў, або якія належалі дзяржаве. Пры гэтым працэнт па крэдыту для аднаасобнай гаспадаркі быў удвая ніжэйшы, чым для абшчыны. З дапамогай гэтага банка дзяржава дапамагала многім сялянскім сем'ям у набыцці зямель.

Найважнейшым элементам сталыпінскіх рэформаў быў кааператыўны рух, у тым ліку крэдытная кааперацыя. Крэдытныя адносіны аказалі істотныў плыў на развіццё вытворчых, спажывецкіх і збытавых кааператываў. Сялянамі на кааператыўных пачатках ствараліся малочныя і алейныя арцелі, сельскагаспадарчыя таварыствы, арцельныя малочныя заводы [6, с. 208].

У мэтах паспяховай рэалізацыі сталыпінскіх пераўтварэнняў 4 ліпеня 1912 г. быў прыняты Закон аб пазыках і дапаможніках сасродкаў казны пры землеўпарадкаванні, які прадаставіў Камітэту па землеўпарадкавальных справах прызначаць пазыкі, а ў асаблівых выпадках і беззваротныя, на агранамічную дапамогу, арганізацыю і развіццё вогнеўстойлівага будаўніцтва, меліярацыю і на іншыя мерапрыемствы, якія садзейнічалі паляпшэнню сялянскай гаспадаркі і

побыту. Дзейнасць Сялянскага банка не дала жаданых вынікаў. Усяго за 1906 – 1915 гг. банк набыў для продажу сялянам 4614 тыс. дзесяцін зямлі, падняўшы цэны за дзесяціну зямлі. Высокія цэны і вялікія плацяжы, якія накладаліся банкам на пазычальнікаў, вялі да спусташэння массы хутаран і адрубнікоў. Усё гэта падрывала давер сялян да банка, і колькасць новых пазычальнікаў пайшла ўніз [5, с. 762].

У перыяд правядзення аграрнай рэформы назіраліся пашырэнне пасяўных плошчаў, рост сельскагаспадарчай вытворчасці. Больш актыўна выкарыстоўваліся сельскагаспадарчыя машыны, мінеральныя ўгнаенні. Стабільнымі сталі ўраджаі. Заможныя сялянскія гаспадаркі пастуова ўключаліся ў таварна-грашовыя адносіны, прапаноўвалі сваю прадукцыю для продажу на рынак. Разбурэнне сельскай абшчыны і дазвол сялянам замацоўваць свае зямельныя надзелы ва ўласнасць стварылі ўмовы для рэалізацыі паскоранага «амерыканскага» шляху развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы: укараненне машын, выкарыстання перадавых спосабаў агратэхнікі і аграхіміі, стварэння хутарскіх (фермерскіх) гаспадарак, замацавання зямлі за непасрэдным вытворцам-фермерам, свабоднага продажу і куплі зямлі, распаўсюджвання арэнды, выкарыстання наёмнай працы.

У выніку сталыпінскіх пераўтварэнняў у Беларусі плошча абшчыннага землеўладання прыкметна скарацілася. Так, па стане на 1 студзеня 1916 г. у Магілёўскай губерніі было замацавана за сялянамі ў асабістую ўласнасць 67.3 % абшчынных зямель, у Віцебскай – 30.2%. У той жа час у цэлым па Расіі з абшчыны выйшла толькі 20% двароў.

З іншага боку, будучы па сваім змесце прагрэсіўнай для свайго часу, сталыпінская рэформа забяспечвала прагрэс па найбольш балючым для сялянства шляху. За гады рэформаў у Беларусі, як і ў Расіі ў цэлым, адбылося значнае расслаенне сялянства. Да 1914 г. бедната складала 68 % двароў, сярэдняе сялянства – 20, кулацкія гаспадаркі – 12 %. Нельга не адзначыць прымусовы характар рэформы, звязаны з ціскам на сялян з мэтай іх выхаду з абшчыны. Далёка не ўсюды ўлічвалася сацыяльна-псіхалагічная гатоўнасць сялянства да новых форм гаспадарання. Сярод стрымліваючых фактараў яе правядзення ў арганізацыйным плане трэба адзначыць адсутнасць адпаведнай матэрыяльна-фінансавай базы спецыялістаў-землямераў у галіне землеўпарадкавання. Краіна па-ранейшаму пакутавала ад тэхнічнай, эканамічнай і культурнай адсталасці.

Сталыпінская рэформа была кампраміснай, захавалася і памешчыцкае землеўладанне. Беднасць пераважнай большасці сялян пакінула сялянскае пытанненя вырашаным. Абмежаваны характар мела і ўвядзенне земстваў, што адбылося толькі ва ўсходнебеларускіх губернях. І ўсё ж гэта сведчыла аб развіцці буржуазных адносін шляхам рэформаў, карысць ад якіх атрымалі ў першую чаргу памешчыкі і заможныя сяляне. Пачатак Першай сусветнай вайны перапыніў рэалізацыю рэформы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**:

1. Именной Высочайший Указ 14 марта 1911 г. о распространении действия Положения о земских учреждениях на Витебскую, Волынскую, Киевскую, Минскую, Могилевскую и Подольскую губернии // Свод законов Российской империи. – Т. 2. Положение о губернских и уездных учреждениях. Изд-е 1915 г. – СПб.: Гос. тип-я, 1915. – 419 с.

2. Кручок, П. С. Сялянскія перасяленні з Беларусі ў гады сталыпінскай аграрнай рэформы / П. С. Кручок // Працы БДТУ. Серыя 6: Гісторыя, Філасофія – Мінск, 2017. – С. 31–35.

3. Орлов, М. А. Актуальность аграрных реформ П. А. Столыпина в наше время [Электронный ресурс] / М. А. Орлов, Н. И. Багдалова // Бюллетень медицинских интернет-конференций. – 2015. – Т. 5. – № 12. – С. 1579. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/aktualnost-agrarnyh-reform-p-a-stolypina-v-nashe-vremya/viewer. – Дата доступа: 28.09.2023.

4. Демичев, Д. М. Некоторые особенности столыпинских преобразований на белорусских землях [Электронный ресурс] / Д. М. Демичев // Право и государство: теория и практика. – 2017. – № 1. – С. 41–47. – Режим доступа:https://cyberleninka.ru/article/n/nekotorye-osobennosti-stolypinskih-preob. – Дата доступа: 28.09.2023.

5. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі: у 5 т. – Пад рэд. У.М. Перцава і інш. – Мінск: Акадэмія Навук БССР, 1953. – Т.3 – С. 762–763.

6. Малиновская, А. В. Аграрная реформа П. А. Столыпина [Электронный ресурс] / А. В. Малиновская, Т. А. Яковлева // Научные труды Вольного экономического общества России – 2014. – № 1. – С. 203–215. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/agrarnaya-reforma-p-a-stolypina-2/viewer. – Дата доступа: 28.09.2023.